**<u>В. Ф. КАЛЯСІНСКІ</u>**
***(Мінск, Беларусь)***

# УНЁСАК В.Н. РАБЦЭВІЧА Ў ВЫВУЧЭННЕ МАНЕТ ВАЙСКОВЫХ КААПЕРАТЫВАЎ 1925–1939 гг. НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Валянцін Навумавіч Рабцэвіч першым сярод беларускіх даследчыкаў звярнуў увагу на кааператыўныя манеты польскіх вайсковых частак 1925–1939 гг. і першым вылучыў у асобны раздзел ту іх частку, якая мела абарачэнне ў Заходняй Беларусі. Манеты вайсковых частак Заходняй Беларусі пазней адасобіў у сваіх даследваннях польскі нумізмат М. Барташавіцкі. У 1968 г. кааператыўныя вайсковыя манеты былі апублікаваны В. Н. Рабцэвічам у выданні «О чем рассказывают монеты». Звесткі пра іх і самі прадметы для ілюстрацый былі прадастаўлены з асабістай калекцыі П. П. Казея, які быў сябрам В. Н. Рабцэвіча і аўтарам мастацкага афармлення ягоных кніг. У шасцідзесятыя гады XX ст. нумізматы нават у Польшчы мала звярталі ўвагу на манеты польскіх ваенных кааператываў, таму публікацыя В. Рабцэвіча была адной з першых па дадзенай тэматыцы. Нераспрацаванасць тэмы і недахоп літаратуры прывялі ў выніку да памылак у атрыбуцыі. Напрыклад, 13-ы полк уланаў памылкова прыпісаны Вілейцы. Насамрэч, на манеце пазначана «Новая Вілейка», што на тэрыторыі сучаснай Літвы. А 23-ці полк уланаў гродзенскіх дыслацыраваўся ў Падброддзе, што таксама на тэрыторыі сучаснай Літвы, а не Гродна, і г. д.

В. Н. Рабцэвіч лічыў манеты польскіх ваенных кааператываў важнай і неад'емнай часткай грашовага абарачэння Беларусі, аб чым сведчыць змяшчэнне іх ў трох сваіх выданнях, што спрыяла абуджэнню ўвагі да гэтай тэмы сярод навукоўцаў, калекцыянераў і наогул яе папулярызацыі.